# КАЛЯНДАР ЮБІЛЕЙНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ НА 2022 ГОД

**Клецк,** горад, цэнтр раёна Мінскай вобласці (1127) — **895 гадоў з часу першага ўпамінання ў летапісах**

**Чэрвень,** горад, цэнтр раёна Мінскай вобласці (1387) — **635 гадоў з часу першых звестак**

**Налібоцкая шкляная мануфактура,** адна з буйнейшых шкляных мануфактур XVIII—XIX стст. у Беларусі, заснаваная Радзівіламі (Стаўб. р-н), 1717 — 1866) — **305 гадоў з пачатку існавання**

**Лышчэня Захар** (1917, Любан. р-н — 1945), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

**Барысаў,** горад, цэнтр раёна Мінскай вобласці (1102) — **920 гадоў з часу першага ўпамінання ў "Аповесці мінулых гадоў"**

**Радзівіл Мікалай (мянушка Руды)** (1512—1584), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ — **510 г.**

## Студзень

**1 — Марозаў Міхаіл** (1922, г. Барысаў — 1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **100 г.**

**1 — Баркоўскі Віталь** (1947, былая в. Астравы, Мін. р-н), акцёр і рэжысёр тэатра, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **75 г.**

**1 — Хвалей Яўген** (1947, в. Белькаўшчына, Стаўб. р-н), паэт, крытык, публіцыст — **75 г.**

**1 — Доўнар Аляксандр** (1972, в. Загараны, Вілейс. р-н), вучоны-гісторык, даследчык сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі XV-XVIII стст., аўтар прац аб гарадскім самакіраванні на беларускіх землях ў XV—XVIII стст. — **50 г.**

**1 — Чэрвеньскі раённы краязнаўчы музей** (1992), дзяржаўная ўстанова — **30 г.**

**2 — Сакалоўскі Анатоль** (1937, в. Палікараўка Слуцкі р-н — 2013) — вучоны ў галіне траўматалогіі і артапедыі, стваральнік новага напрамку хірургіі тазасценавога сустава, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **85 г.**

**2** — **Арловіч Валянцін** (1947, в. Краснае, Маладзеч. р-н), вучоны-фізік, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **75 г.**

**2** — **Шарый Валерый** (1947, г. Чэрвень), спартсмен і трэнер (цяжкая атлетыка), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіён XXI летніх Алімпійскіх гульняў, чэмпіён свету і Еўропы, сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянатаў Еўропы, мнагакратны рэкардсмен свету і СССР, кавалер ордэна Дружбы народаў — **75 г.**

**3** — **Гігевіч Васіль** (1947, в. Жыцькава, Барыс. р-н), пісьменнік, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі — **75 г.**

**7** — **Адамовіч Язэп** (1897, г. Барысаў — 1937), дзяржаўны, ваенны, палітычны дзеяч — **125 г.**

**8** — **Карабан Сцяпан** (1902, в. Дзехнаўка, Мін. р-н — 1974), літаратуразнаўца, даследчык філасофскіх і літаратурна-эстэтычных поглядаў В. Бялінскага і Д. Пісарава, праблематыкі творчасці Я. Купалы — **120 г.**

**9** — **Рашкоўскі Леанід** (1937, г. Барысаў — 1994), паэт, аўтар шэрагу зборнікаў вершаў — **85 г.**

**10** — **Пашкевіч Васіль** (1857, в. Сямёнавічы, Уздзен. р-н — 1939), расійскі і беларускі вучоны ў галіне пладаводства, адзін з заснавальнікаў навуковага садоўніцтва ў Беларусі, акадэмік УАСГНІЛ, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Расіі — **165 г.**

**10** — **Ванькові Мельхіёр** (1892, в. Калюжыца, Бярэз. р-н — 1974), польскі пісьменнік, публіцыст, выдавец, удзельнік Першай сусветнай вайны — **130 г.**

**12** — **Калачынскі Міхась (Міхаіл)** (1917, г. Крупкі — 1990), паэт, перакладчык, кінасцэнарыст, заслужаны работнік культуры Беларусі — **105 г.**

**12** — **Шахновіч Васіль** (1922, Слуцкі р-н — 1983), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, генерал-лейтэнант — **100 г.**

**13** — **Якімовіч Міхаіл** (1967, г. Слуцк), спартсмен (гандбол), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіён XXV летніх Алімпійскіх гульняў, сярэбраны прызёр чэмпіянату свету, ганаровы грамадзянін Слуцка — **55 г.**

**14** — **Аўхімовіч Мікалай** (1907, г. Барысаў — 1996), партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў партызанскага руху і патрыятычнага падполля ў Мінскай і Палескай абласцях у

Вялікую Айчынную вайну, узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, ордэнам “Знак Пашаны” — **115 г.**

**14 — Шомаў Аляксандр** (1962, г. Барысаў), скульптар, аўтар твораў у станковай, паркавай і мемарыяльнай скульптуры — **60 г.**

**15 — Непачаловіч Іван** (1922, в. Арэхаўка, Старадар. р-н — 1990), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **100 г.**

**20 — Лушчыцкі Іван** (1907, в. Агароднікі, Капыл. р-н — 1973), вучоны ў галіне філасофіі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, кавалер ордэнаў Леніна і “Знак Пашаны” — **115 г.**

**20 — Прылуцкі заказнік** (1977, Мін. р-н), рэспубліканскі біялагічны заказнік — **45 г. з часу стварэння**

**23 — Кулагін Анатоль** (1947, г. Барысаў), мастацтвазнаўца, гісторык архітэктуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” — **75 г.**

**24 — Купрэвіч Васіль** (1897, в. Кальнікі, Смаляв. р-н — 1969), вучоны-батанік, заснавальнік глебавай энзімалогіі, акадэмік НАН Беларусі, член-карэспандэнт АН СССР, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, дзяржаўны дзеяч, узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам “Знак Пашаны” — **125 г.**

**24 — Філіял “Яхімоўшчына” Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы** (1997, в. Яхімоўшчына, Маладзеч. р-н) — **25 гадоў з часу заснавання** (адкрыты для наведвальнікаў у 2001 г.)

**25 — Ткачоў Уладзімір** (1947, в. Нізок, Уздзен. р-н), мастак, які працуе ў дэкаратыўна-прыкладным і манументальным мастацтве, станковым жывапісе, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **75 г.**

**31 — Гурло Алесь (Аляксандр)** (1892, г. Капыль — 1938), паэт, журналіст, перакладчык, фалькларыст — **130 г.**

**31 — Зіноўеў Мікалай** (1922—1944), удзельнік вызвалення Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **100 г.**

**Люты**

**3** — **Кохан (Коханаў) Яўхім** (1912, Слуцкі р-н — 1993), паэт — **110 г.**

**3** — **Шышлоў Мікалай** (1947, г. Жодзіна), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка), жывапісец, графік — **75 г.**

**4** — **Шантыр Фабіян** (1887, г. Слуцк — 1920), палітычны і грамадскі дзеяч, пісьменнік, публіцыст — **135 г.**

**4** — **Суша Мікалай** (1952, в. Вайнілава, Чэрв. р-н), вучоны ў галіне эканомікі і кіравання, акадэмік Міжнароднай акадэміі арганізацыйных і кіраўніцкіх навук, выдатнік адукацыі Беларусі, лаўрэат Міжнароднай прэміі Санкт-Пецярбурскага фонду прафесійнай адукацыі — **70 г.**

**13** — **Хурсік Сымон** (1902, Пух. р-н — 1972), пісьменнік — **120 г.**

**15** — **Рабкевіч Валянцін** (1937, в. Аксаміты, Капыл. р-н — 1995), паэт, перакладчык, мовазнаўца — **85 г.**

**16** — **Мурашка Рыгор** (1902, в. Бязверхавічы, Слуцкі р-н — 1944), пісьменнік, крытык — **120 г.**

**17** — **Ельскі Канстанцін** (1837, в. Ляды, Ігумен. пав. Мін. губ. (цяпер Смаляв. р-н) — 1896), вучоны-біёлаг, географ, геолаг, падарожнік, які працаваў за межамі Беларусі — **185 г.**

**19** — **Шутаў Альфрэд** (1932, Чэрв. р-н — 2005), дзеяч самадзейнага мастацтва, заслужаны работнік культуры Беларусі — **90 г.**

**20** — **Мазынскі Валерый** (1947, в. Вялікае Стахава, Барыс. р-н), рэжысёр тэатра, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **75 г.**

**20** — **Шульга Іван** (1947, в. Малая Бахаўшчына, Нясвіж. р-н), спартсмен і трэнер (пажарна-выратавальны спорт), майстар спорту СССР, чэмпіён СССР, мнагакратны рэкардсмен Беларусі, заслужаны трэнер Беларусі, які падрыхтаваў больш за 30 майстроў спорту — **75 г.**

**20** — **Фёдараў Аляксандр** (1952, г. Барысаў), дырыжор, заслужаны артыст Беларусі — **70 г.**

**22** — **Варанько Кацярына** (1947, в. Казловічы, Слуцкі р-н), бібліятэкар-бібліёграф, складальнік і рэдактар шэрагу бібліяграфічных паказальнікаў, аўтар вялікай колькасці публікацый, прысвечаных выдатным дзеячам беларускай і сусветнай

навукі і культуры, уладальніца Ганаровай граматы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь — **75 г.**

**25** — **Шуба Аляксей** (1912, в. Падарэссе, Старадар. р-н — 1971), удзельнік савецка-фінлядскай вайны 1939—1940 гг., адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, адзін з арганізатараў лячэбна-прафілактычнай дапамогі ў Беларусі, заслужаны ўрач Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы — **110 г.**

## Сакавік

**Зянько-Пачыкоўская Сафія** (1892, в. Ласокіна, Ашмян. пав., Вілен. губ. (цяпер Валож. р-н — 1977), народная спявачка і казачніца — **130 г.**

**Кандраценя Уладзімір** (1917, в. Смалічы, Капыл. р-н — 1943), пісьменнік — **105 г.**

**1** — **Камароўскі Алесь (Аляксандр)** (1947, в. Мікалаеўшчына, Стаўб. р-н), пісьменнік, аўтар шэрагу зборнікаў паэзіі і прозы — **75 г.**

**1** — **Мацкевіч Уладзімір** (1947, г. Мар’іна Горка, Пух. р-н), дзяржаўны дзеяч, генерал-лейтэнант, дыпламат — **75 г.**

**3** — **Цадроўскі Ян, сын Яна** (1617, в. Пагост, Салігор. р-н — 1688 ці 1682), грамадска-палітычны дзеяч ВКЛ, пісьменнік-мемуарыст — **405 г.**

**3** — **Шыманскі Сцяпан** (1912, Пух. р-н — 1989), ваенны дзеяч, удзельнік савецка-фінлядскай вайны 1939—1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны, генерал-лейтэнт авіяцыі — **110 г.**

**3** — **Кавалёнак Уладзімір** (1942, в. Белае, Крупскі р-н), лётчык-касманаўт, вучоны ў галіне ваенных навук, акадэмік Расійскай акадэміі касманаўтыкі імя К. Э. Цыялкоўскага, генерал-палкоўнік авіяцыі, двойчы Герой Савецкага Саюза, Герой ГДР, Герой Манголіі, кавалер многіх ордэнаў Беларусі, Расіі і СССР — **80 г.**

**3** — **Грышановіч Валерый** (1947, г. п. Халопенічы, Крупскі р-н), паэт, публіцыст — **75 г.**

**3** — **Ржэвуцкі Міхаіл** (1947, Барыс. р-н), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка), жывапісец, аўтар пейзажаў, нацюрмортаў — **75 г.**

3 — **Будай Уладзімір** (1947, Дзяржын. р-н), спявак (тэнар), заслужаны артыст Беларусі — **75 г.**

**4 — Ельскі Казімір** (1782, в. Дудзічы, Пух. р-н — 1867), скульптар, першы прафесар скульптуры ў Беларусі — **240 г.**

**4 — Петрусевіч Казімір** (1872, Капыл. р-н — 1949), грамадска-палітычны дзеяч, адвакат, удзельнік Першага з'езду РСДРП, рэвалюцыі 1905—1907 гг. — **150 г.**

**4 — Карказовіч Казімеж** (1907, в. Трасцянец, Слуцкі р-н — 1996), пісьменнік, аўтар шэрагу раманаў, апавяданняў — **115 г.**

**7 — Гінтаўт Вітольд** (1922, в. Слабашчына, Мін. р-н — 1987), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **100 г.**

**8 — Чарвякоў Аляксандр** (1892, в. Дукарка, Ігум. пав., Мін. губ. (цяпер в. Дукора Пух. р-н) — 1937), дзяржаўны і палітычны дзеяч БССР і СССР, адзіны з ініцыятараў беларусізацыі, імем якога названа вуліца ў г. Мінску — **130 г.**

**14 — Цыбульская Лідзія** (1927, в. Магільна, Уздзен. р-н), казачніца, носьбіт і захавальніца фальлорных традыцый, проза казачніцы ўнесена ў Спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі — **95 г.**

**21 — Васюкова Галіна** (1927, г. Барысаў — 2004), пісьменніца, аўтар шэрагу зборнікаў апавяданняў і аповесцей для дзяцей — **95 г.**

**21 — Ісаёнак Мікалай** (1947, в. Чарневічы, Барыс. р-н), жывапісец, які працуе ў станковым жывапісе ў жанрах лірычнага пейзажа, сюжэтна-тэматычнай карціны, нацюрморта — **75 г.**

**21 — Максімовіч Валерый** (1962, в. Траянец, Лагойскі р-н), літаратуразнаўца, крытык, паэт, аўтар вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў для вышэйшай школы і настаўнікаў, лаўрэат прэміі НАН Беларусі — **60 г.**

**25 — Старадарожскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей** (1999), дзяржаўная ўстанова — **20 гадоў з часу адкрыцця для наведвальнікаў**

**28 — Мікалай (Васюковіч Мікалай)** (1882, в. Коскі, Мін. пав. (цяпер Дзярж. р-н) — 1937), дыякан, новапакутнік Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы — **140 г.**

**28 — Каўко Аляксей** (1922, в. Міраслаўка, Бярэз. р-н — 2012), пісьменнік, журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі — **100 г.**

## Красавік

**1 — Багдановіч Адам (Адольф)** (01 ці 06.04.1862, г. п. Халопенічы, Крупскі р-н — 1940), этнограф, фальклaрыст, мовазнаўца, гісторык культуры, мемуарыст — **160 г.**

**1 — Жук Алесь (Аляксандр)** (1947, в. Клешаў, Слуцкі р-н), пісьменнік, перакладчык, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, літаратурнай прэміі імя І. Мележа і Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа — **75 г.**

**4 — Клявакіна Вольга** (1962, г. Салігорск), спартсменка (плаванне), майстар спорту СССР міжнароднага класа, бронзавы прызёр XXII Алімпійскіх гульняў, сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянатаў Еўропы — 60 г.

**10 — Купрыянава Настасся** (1872, в. Мяхеды, Лагойскі р-н — 1979), маці-патрыётка, пяцёра сыноў якой загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну. Правобраз гераіні Манумента ў гонар Маці-патрыёткі ў Жодзіна — **150 г.**

**10 — Лагун Уладзімір** (1922, в. Азломль, Любан. р-н — 2004), жывапісец, які працаваў у жанрах тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа — **100 г.**

**15 — Гаўзэ Файвель (Файфель)** (1897, г. Слуцк — 1990), юрыст, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай школы грамадзянскага права — **125 г.**

**15 — Нікановіч Мікола (Мікалай)** (1902, Смаляв. р-н — 1944), пісьменнік, перакладчык — **120 г.**

**16 — Савіч Уладзімір** (1952, в. Акцябар, Лагойскі р-н), жывапісец, графік, мастак кнігі, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ганаровы член Расійскай акадэміі мастацтваў, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна Ф. Скарыны — **70 г.**

**20 — Зыль Васіль** (1902, в. Востраў, Смаляв. р-н — 1973), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **120 г.**

**20 — Сільнова Людка (Людміла)** (1957, г. Маладзечна), паэтэса, празаік, крытык, бібліятэкар, аўтар публікацый па гісторыі прыватных кнігазбораў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — **65 г.**

**21 — Слабодчыкаў Уладзімір** (1952, в. Даўгінава, Вілейс. р-н), скульптар, аўтар твораў у манументальнай, станковай і паркавай скульптуры, медальерным мастацтве, педагог, заслужаны дзеяч

мастацтваў Беларусі, ганаровы член Расійскай акадэміі мастацтваў, лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы — **70 г.**

**29** — **Маладзечанскі станкабудаўнічы завод**, ААТ (1947) — **75 гадоў з часу стварэння**

## Май

**1** — **Палаўчэня Гаўрыіл** (1907, в. Лескі ці Языль, Бабр. пав., Мін. губ (цяпер Старадар. р-н.) — 1988), удзельнік савецка-фінляндскай 1939—1940 гг. і Вялікай Айчыннай войнаў, Герой Савецкага Саюза — **115 г.**

**1** — **Салавей Алесь (сапр. Радзюк Альфрэд)** (1922, Дзяржын. р-н — 1978), паэт, празаік, перакладчык у эміграцыі (Аўстралія) — **100 г.**

**1** — **Карнач Генадзь** (1932, в. Клінок, Чэрв. р-н — 1996), мастацтвазнаўца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **90 г.**

**1** — **Кляўко Генадзь** (1932, в. Варонічы, Пух. р-н — 1979), паэт, перакладчык, азтар шэрагу зборнікаў вершаў і паэм, журналіст — **90 г.**

**1** — **Басалыга Міхаіл** (1942, г. Слуцк), мастак, які працуе ў кніжнай і станковай графіцы, пераважна ў гістарычным і батальным жанрах, педагог, творы якога захоўваюцца ў вядучых музеях Беларусі, Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі ў Маскве — **80 г.**

**2** — **Капуцкі Андрэй** (1897, г. Маладзечна — 1934), дзеяч рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, удзельнік грамадзянскай вайны, паэт, журналіст — **125 г.**

**2** — **Аўсіевіч Сяргей** (1927, Бярэз. р-н), заслужаны работнік прамысловасці Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы — **95 г.**

**4** — **Прашковіч Мікола** (1932, в. Гарадзішча, Бярэз. р-н — 1983), гісторык, грамадскі дзеяч — **90 г.**

**5** — **Кадыгробаў Усевалад** (1877, в. Зембін, Барыс. р-н — пасля 1915), краязнаўца, адзін з заснавальнікаў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, грамадскі дзеяч — **145 г.**

**5** — **Ксяневіч Іван** (1937, в. Русаковічы, Стаўб. р-н — 2007), беларускі і расійскі вучоны ў галіне трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання, эканаміст, аўтар падручнікаў для вышэйшых навучальных устаноў, акадэмік Расійскай акадэміі сельскагаспадарчых навук, заслужаны дзеяч навукі Расіі,

лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, прэміі Савета Міністраў СССР, Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна “Знак Пашаны” — **85 г.**

**9** — **Мялешка Міхась (Міхаіл)** (1892, в. Скары, Мядзел. р-н — 1941), вучоны ў галіне гісторыі і археаграфіі, этнограф, пісьменнік, публіцыст, краязнаўца, бібліёграф, адзін з арганізатараў архіўнай справы Беларусі, член Інбелкульта — **130 г.**

**9** — **Мыслівец Валянцін** (1937, в. Хазянінкі, Пух. р-н — 1993), празаік, аўтар раманаў, аповесцей, апавяданняў, нарысаў — **85 г.**

**14** — **Жыновіч (Жыдовіч) Іосіф** (1907, в. Арэшкавічы, Пух. р-н — 1974), цымбаліст, дырыжор, кампазітар, народны артыст Беларусі і СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, узнагароджаны двума ордэнамі “Знак Пашаны” — **115 г.**

**16** — **Багадзяж Мікола (Мікалай)** (1957, в. Траянаўка, Барыс. р-н), пісьменнік, журналіст, аўтар і суаўтар гісторыка-біяграфічных кніг аб выдатных асобах Беларусі — **65 г.**

**20** — **Пушча Язэп (сапр. Плашчынскі Іосіф)** (1902, в. Каралішчавічы, Мін. р-н — 1964), паэт, асобныя творы якога пакладзены на музыку, крытык, перакладчык, адзін з заснавальнікаў літаратурных аб’яднанняў “Маладняк” і “Узвышша” — **120 г.**

**21** — **Гурбан Іван** (1922, Нясвіж. р-н — 1999), пісьменнік — **100 г.**

**21** — **Ляўко Вольга** (1947, Капыл. р-н), вучоны-археолаг, гісторык, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **75 г.**

**25** — **Нясвіжскі кадэцкі корпус**, акадэмія (1747, г. Нясвіж — 1780-я гг.), ваенная навучальная ўстанова ў Нясвіжы ў XVIII ст. для падрыхтоўкі кадраў войска Радзівілаў — міліцыі — **275 г.**

**25** — **Жукоўскі Сымон (у манастве Себасцьян)** (1782, Лагойскі р-н — 1834), гісторык, філолаг — **240 г.**

**25** — **Непачаловіч Янка (Іван)** (1917, в. Мінкавічы, Бабр. пав., Мін. губ. (цяпер Старадар. р-н) — 1969), паэт, аўтар шэрагу паэтычных зборнікаў — **105 г.**

**26** — **Галубовіч Янка (Іван)** (1942, в. Пранчэйкава, Маладзеч. р-н), пісьменнік, аўтар аповесцяў, апавяданняў, казак — **80 г.**

**27** — **Сабалеўскі Анатоль** (1932, в. Андрыеўшчына, Дзяржын. р-н — 2012), тэатразнаўца, педагог, літаратуразнаўца, адзін з вядучых даследчыкаў айчыннага тэатра і драматургіі, лаўрэат Міжнароднай

прэміі UNITY “Адзінства”, тэатральнай прэміі імя К. Крапівы — **90 г.**

**29** — **Леўчанка Леанід** (1932, г. Мар’іна Горка), жывапісец — **90 г.**

## Чэрвень

**2** — **Карстэн (дзявочае Хадатовіч) Кацярына** (1972, в. Асечана, Крупскі р-н), спарсменка (веславанне акадэмічнае), заслужаны майстар спорту Беларусі, чэмпіёнка XXVI і XXVII летніх Алімпійскіх гульняў, сярэбраны прызёр XXVIII летніх Альмпійскіх гульняў, бронзавы прызёр XXV Летніх Алімпійскіх гульняў і XXIX летніх Алімпійскіх гульняў, мнагакратная чэмпіёнка свету, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Беларускі спартыўны Алімп”, узнагароджана ордэнамі Пашаны, Айчыны III ступені, Айчыны II ступені, Айчыны I ступені, ганаровы грамадзянін Крупскага раёна — **50 г.**

**5** — **Шавель Кастусь (Канстанцін)** (1912, Уздзен. р-н — 1987), паэт — **110 г.**

**5** — **Рагойша Вячаслаў** (1942, аг. Ракаў, Валож. р-н), крытык, літаратуразнаўца, перакладчык, педагог, аўтар вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых навучальных устаноў, выдатнік адукацыі Беларусі, лаўрэат Міжнароднай літаратурнай прэміі імя І. Франко, кавалер ордэна Францыска Скарыны — **80 г.**

**8** — **Мемарыяльная сядзіба “Смольня”, філіял Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа** (1967, Стаўб. р-н) — **55 г.**

**10** — **“Катэхізіс”**, першая кніга на беларускай мове (1562, г. Нясвіж), праца Сымона Буднага, першая кніга на беларускай мове, выдадзеная на тэрыторыі сучаснай Беларусі — **460 г.**

**12** — **Нясвіжскі кляштар бенедыкцінак** (1592—1877), помнік архітэктуры барока, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — **425 г.**

**13** — **Квяткоўскі Аляксандр** (1952, г. Валожын), жывапісец — **70 г.**

**13** — **Жук Ігар** (1957, в. Зані, Мядзел. р-н — 2017), літаратуразнаўца, крытык, педагог, даследчык пытанняў развіцця беларускай літаратуры, асаблівасцей нацыянальнай прозы і драматургіі XX ст., аўтар прац аб творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, К. Чорнага, М. Гарэцкага і інш. — **65 г.**

**14** – **Крайко Уладзімір** (1907, в. Матарова, Пух. р-н – 1972), адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну – **115 г.**

**15** – **Акаловіч Іван** (1922, в. Малыя Жаберычы, Крупскі р-н – 1989), удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, поўны кавалер ордэна Славы – **100 г.**

**18** – **Барташэвіч Галіна** (1932, г. Слуцк), фальклярыст, адна з першых і знаных даследчыкаў каляндарнай абраднасці беларусаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – **90 г.**

**20** – **Паплаўскі Канстанцін** (1912, в. Сівіца, Валож. р-н – 1984), харавы дырыжор, кампазітар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – **110 г.**

**23** – **Лосік Георгій** (1947, в. Леніна, Слуцкі р-н), вучоны-псіхолаг, спецыяліст у галіне інжынернай тэхнікі, біякібернетыкі, адзін з пачынальнікаў работ па стварэнні спецыяльных камп'ютараў з сінтэзатарам мовы для невідушчых – **75 г.**

**23** – **Марзалюк Васіліса** (1987, г. Лагойск), спартсменка (барацьба вольная), заслужаны майстар спорту Беларусі, бронзавы прызёр чэмпіянатаў свету, сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянатаў Еўропы, чэмпіёнка I і II Еўрапейскіх гульняў – **35 г.**

**24** – **Ходзька (Барэйка) Ян** (1777, г. п. Крывічы, Мядзел. р-н – 1851), пісьменнік, драматург, грамадскі дзеяч, удзельнік паўстання 1830–1831 гг. – **245 г.**

**24** – **Крук Уладзімір** (1927, г. Чэрвень – 2008), фатограф, фотакарэспандэнт газеты "Літаратура і мастацтва", часопіса "Тэатральная Беларусь" ("Тэатральная творчасць"), работы якога экспанаваліся ў Аўстраліі, Румыніі і іншых краінах – **95 г.**

**24** – **Кірухіна Людміла** (1952, г. Мар'іна Горка, Пух. р-н), бібліятэказнаўца, заслужаны работнік культуры Беларусі, галоўны рэдактар часопіса "Бібліятэчны свет" і навукова-практычнага зборніка "Бібліятэчны веснік" – **70 г.**

**26** – **Бабук Уладзімір** (1897, в. Навасёлкі, Пух. р-н – 1977), хірург, выдатнік аховы здароўя, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, кавалер ордэна Леніна – **125 г.**

**28** – **Кудраўцаў Іван** (1922, в. Сінянец, Салігор. р-н – 2004), пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца, даследчык творчасці З. Бядулі, П. Глебкі, Я. Коласа, К. Чорнага, А. Гурло і інш. – **100 г.**

**29** — **Калядка Мікалай** (1952, г. Любань), дырыжор, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **70 г.**

**Ліпень**

**2** — **Дастанка Анатоль** (1937, в. Вобчын, Любан. р-н), вучоны ў галіне мікраэлектронікі, аўтар падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для вышэйшай школы, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, заслужаны вынаходнік СССР, лаўрэат дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі НАН Беларусі, прэміі акадэміі навук Украіны, Беларусі і Малдовы, ганаровы грамадзянін г. Любань — **85 г.**

**6** — **Харашэвіч Кастусь (Канстанцін)** (1927, в. Літва, Маладзеч. р-н — 2013), мастак, які працаваў у станковым жывапісе ў жанрах пейзажа і партрэта, стварыў шэраг сюжэтна-тэматычных карцін — **95 г.**

**7** — **Купала Янка (сапраўднае імя Луцэвіч Іван Дамінікавіч)** (1882, Маладзеч. р-н — 1942), паэт, драматург, публіцыст, перакладчык, класік беларускай літаратуры, народны паэт Беларусі, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі і АН Украіны, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1941) — **140 г.**

**8** — **Бруй (Бруй-Шуляк) Вікенцій** (1912, Валож. р-н — 1985), артыст оперы, заслужаны артыст Беларусі — **110 г.**

**9** — **Астрэйка Сяргей** (1912, Капыл. р-н — 1937), паэт — **110 г.**

**9** — **Карпенка Марыя** (1932, Капыл. р-н — 2020), журналіст, публіцыст, заслужаны работнік культуры Беларусі — **90 г.**

**10** — **Старадарожскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей** (2002), дзяржаўная ўстанова — **20 гадоў з часу адкрыцця для наведвальнікаў**

**11** — **Анікейчык Анатоль** (1932, Барыс. р-н — 1989), скульптар, педагог, народны мастак Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974), прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1967) — **90 г.**

**17** — **Таразевіч Георгій** (1937, в. Слабада, цяпер Мядзел. р-н — 2003), дзяржаўны і грамадскі дзеяч — **85 г.**

**20** — **Давідовіч Сяргей** (1942, в. Карпілаўка, Лагойскі р-н), пісьменнік, жывапісец, грамадскі дзеяч, уладальнік знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “За ўклад у развіццё культуры Беларусі”, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, ганаровы грамадзянін Лагойска і Мінскай вобласці — **80 г.**

**25** — **Юшкевіч Часлаў** (1942, Вілейс. р-н — 2007), музыкант (валторна), педагог, заслужаны артыст Беларусі — **80 г.**

**26** — **Патаповіч Мікалай** (1922, в. Старына, Смаляв. р-н — 1985), удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, поўны кавалер ордэна Славы — **100 г.**

**30** — **Вілейскі краязнаўчы музей** (1982), дзяржаўная ўстанова — **40 гадоў з часу заснавання (адкрыты 07.05.1985 г.)**

## Жнівень

**2** — **Барташэвіч Альберт** (1942, в. Раёўшчына, Стаўб. р-н), польскі мовазнаўца, даследчык польскай, беларускай і рускай моў, складальнік першага ў беларускім мовазнаўстве “Адваротнага слоўніка сучаснай беларускай мовы” — **80 г.**

**2** — **Зельская Яніна** (1952, Барыс. р-н), графік — **70 г.**

**5** — **Семяновіч Антон** (1917, в. Шабунеўшчына, Дзяржын. р-н — 2000), крытык, літаратуразнаўца, даследчык беларускай прозы і драматургіі — **105 г.**

**8** — **Чарнышэвіч Аркадзь** (1912, в. Кулакі, Салігор. р-н — 1967), пісьменнік — **110 г.**

**14** — **Мікульчык Аляксандр** (1882, в. Шацк, Пух. р-н — пасля 1918), паэт — **140 г.**

**14** — **Тарлоўскі Васіль** (1902, в. Ачыжа, Чэрв. р-н — 1990), ваенны дзеяч, удзельнік вызвалення Шумілінскага раёна ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **120 г.**

**15** — **Курачыцкі Іван** (1942, в. Заастравечча, Клецкі р-н), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (метал, вітражы), аўтар дэкаратыўных кампазіцый і пано, вітражоў — **80 г.**

**16** — **Максіменя Іосіф** (1912, в. Старына, Капыл. р-н — 1964), удзельнік савецка-фінляндскай вайны, партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **110 г.**

**18** — **Шыракоўскіх Емяльян** (1917, Чэрв. р-н —1982), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы — **105 г.**

**18** — **Трухан Мікола (Мікалай)** (1947, г. п. Плешчаніцы, Лагойскі р-н — 1999), дзеяч культуры, акцёр, рэжысёр, арганізатар і мастацкі кіраўнік тэатра “Дзе-Я?” (з 2004 г. — Новы драматычны тэатр) — **75 г.**

**19** — **Гармоза Міхаіл** (1917, в. Чапля, Дзяржын. р-н — 1985), удзельнік савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

**25** — **Чапскі Эмерык** (1897, в. Станькава, Мін. пав., Мін. губ. (цяпер Дзяржын. р-н) — 1979), польскі гісторык, даследчык сувязяў Рэчы Паспалітай і Італіі — **125 г.**

**27** — **Махнач Алесь (Аляксандр)** (1922, Уздзен. р-н — 2001), драматург, празаік, публіцыст, заслужаны работнік культуры Беларусі — **100 г.**

**27** — **Хадаровіч Уладзімір** (1947, г. Слуцк), мастак, які працуе ў станковым жывапісе ў жанрах пейзажа і нацюрморта — **75 г.**

**29** — **"Акопы", філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы** (1992, в. Харужанцы, Лагойскі р-н) — **30 гадоў з часу адкрыцця**

## Верасень

**1** — **Барысаўскі дзяржаўны каледж** (1892), установа адукацыі — **130 г.**

**11** — **Дзяржынскі Фелікс** (1877, маёнтак Дзяржынава, Ашмян. пав., Вілен. губ (цяпер Стаўб. р-н) — 1926), прафесійны рэвалюцыянер, адзін з кіраўнікоў польскага і расійскага рэвалюцыйнага руху, удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг., Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., грамадзянскай вайны, дзяржаўны і палітычны дзеяч СССР — **145 г.**

**11** — **Пашкевіч Алесь (Аляксандр)** (1972, Слуцкі р-н), літаратуразнаўца, пісьменнік — **50 г.**

**16** — **Лапцік Вячаслаў** (1952, Мядзел. р-н), пісьменнік, публіцыст — **70 г.**

**17** — **Танк Максім (сапраўднае імя Скурко Яўген Іванавіч)** (1912, Мядзел. р-н — 1995), народны паэт Беларусі, грамадскі і дзяржаўны дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1948), Літаратурнай прэміі Я. Купалы (1959), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы (1966), Ленінскай прэміі (1978), Літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева (1980) — **110 г.**

**18** — **Бялевіч Галіна** (1957, в. Хатляны, Уздзен. р-н), спартсменка (інваспорт, лёгкая атлетыка: бег, кіданне дыска), майстар спорту Беларусі, бронзавы прызёр чэмпіянату свету,

сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянатаў Еўропы, мнагакратная чэмпіёнка і рэкардсменка СССР — **65 г.**

**19** — **Букштыновіч Міхаіл** (1892, в. Жомайдзь, Валож. р-н — 1950), ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант, удзельнік Першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, кавалер ордэна Леніна, Чырвонага Сцяга — **130 г.**

**22** — **Коласаўскі заказнік** (1972, Стаўб. р-н), комплекс мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю народнага паэта Беларусі Я. Коласа (уключае сядзібы Акінчыцы, Альбуць, Ласток, Смольня) — **50 г.**

**24** — **Ліхачова Таццяна** (1952, г. Валожын), актрыса тэатра, заслужаная артыстка Беларусі — **70 г.**

**25** — **Дражын Уладзімір** (1947, в. Дражна, Старадар. р-н), дзяржаўны і палітычны дзеяч Беларусі, дыпламат, ганаровы грамадзянін Нясвіжа, кавалер ордэна "Знак Пашаны" — **75 г.**

**28** — **Матросаў Уладзімір** (193, г. Барысаў), беларускі мастак тэатра і кіно, рэжысёр-пастаноўшчык шэрагу спектакляў, аўтар партрэтаў, пейзажаў — **85 г.**

**29** — **Хурс Іван** (1922, в. Клятное, Пух. р-н — 2002), военачальнік, віцэ-адмірал, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны і вайны з Японіяй 1945., кавалер ордэнаў Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі (чатыры разы), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР — **100 г.**

**29** — **Рагалевіч Міхаіл** (1923, п. Глінішчы, Уздзен. р-н — 2010), жывапісец, графік — **90 г.**

**Кастрычнік**

**1 — Вашкевіч Іван** (1937, в. Ганалес, Мін. р-н — 2011),акцёр, тэатральны дзеяч, заслужаны работнік культуры Беларусі — **85 г.**

**2 — Бруй Фёдар** (1907, в. Іванаўскія Агароднікі, Слуцкі р-н — 1982), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ганаровы грамадзянін Слуцка — **115 г.**

**7** — **Пташнікаў Іван** (1932, Лагойскі р-н — 2016), пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000), прэміі імя У. А. Караля (1999) — **90 г.**

**8 — Перагудаў Віктар** (1957, г. Валожын), настаяцель Івянецкай царквы Еўрасінні Полацкай, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" — **65 г.**

**9** – **Хвядчэня Людміла** (1947, Капыл. р-н), вучоны ў галіне моўнай адукацыі, методыкі выкладання замежных моў, педагог, выдатнік адукацыі Беларусі – **75 г.**

**9 – Калеснік Іван** (1932, в. Грычына, Дзяржын. р-н – 1979), паэт, публіцыст, перакладчык – **90 г.**

**12 – Несцярук Юрый** (1957, г. Стоўбцы), мастак, які працуе ў манументальным і станковым жывапісе – **65 г.**

**13 – Вайніловіч Эдвард Адам** (1847, в. Сляпянка, Мін. пав., Мін. губ. (цяпер г. Мінск) – 1928), гаспадарчы і палітычны дзеяч, фундатар Мінскага касцёла святых Сымона і Алены (Чырвонага касцёла) – **175 г.**

**16 – Сенчыкоўскі Франдыск Фердынанд** (1837, маёнтак Сноў, Навагр. пав., Мін. губ. (цяпер аг. Сноў, Нясвіж. р-н) – 1907), дзеяч Рымска-Каталіцкага Касцёлу ў Беларусі і Расіі – **185 г.**

**21 – Бабенка Эрнст** (1937, г.п. Плешчаніцы, Лагойскі р-н – 2019), вучоны ў галіне хімічнай тэхналогіі паліва, педагог, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, кавалер ордэна Дружбы народаў, ганаровы грамадзянін Полацка, Наваполацка – 85 г.

**25** – **Аніскович Уладзімір** (1932, Лагойскі р-н – 2016), перакладчык, крытык, публіцыст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996) – **90 г.**

**27 – "Дарыда"** (1992, аг. Ждановічы, Мін. р-н), прыватнае прадпрыемства па выпуску мінеральных і пітных вод, безалкагольных напояў – **30 гадоў з часу ўтварэння**

**28** – **Шабуня Канстанцін** (1912, Уздзен. р-н – 1984), вучоны-гісторык, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі – **110 г.**

**30 – Мемарыяльная сядзіба "Акінчыцы", філіял Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа** (1982, г. Стоўбцы) – **40 гадоў з часу адкрыцця**

**Лістапад**

**3** – **Колас Якуб (сапраўднае імя Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч)** (1882, Стоўбцы, г. – 1956), народны паэт Беларусі, класік беларускай літаратуры, грамадскі дзеяч, вучоны, педагог, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946, 1949) – **140 г.**

**3 — Шастакоў Міхаіл** (1907, в. Нача, Барыс. пав., Мін. губ. (цяпер Крупскі р-н)— 1942), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **115 г.**

**3 — Ліштван Іван** (1932, в. Дайнава Вялікая, Валож. р-н), вучоны ў галіне калоіднай хіміі, фізікахіміі торфу і прыродакарыстання, акадэмік НАН Беларусі, замежны член Польскай АН, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, ганаровы эколаг Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы, кавалер ордэнаў "Дружбы народаў", Францыска Скарыны — **90 г.**

**4 — Гартны Цішка (сапр. Жылуновіч Змiцер)**(1887, г. Капыль — 1937), пісьменнік, публіцыст, гісторык, акадэмік НАН Беларусі, грамадскі і дзяржаўны дзеяч Беларусі, удзельнік рэвалюцый 1905—1907 гг., грамадзянскай вайны — **135 г.**

**6 — Астроўскі Радаслаў** (1887, Слуцкі р-н — 1976), палітычны і грамадскі дзеяч, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху, рэвалюцыі 1905—1907 гг., Слуцкага паўстання 1920 г., арганізатар і дырэктар Слуцкай гімназіі, дзеяч Беларускага замежжа, прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады — **135 г.**

**6 — Дзяржынскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей** (1987), дзяржаўная ўстанова — **65 гадоў з часу адкрыцця для наведвальнікаў** (заснаваны ў 1985 г.)

**7 — Мірановіч Яўген** (1917, г.п. Смілавічы, Чэрвен. р-н — 1980), дзяржаўны і гаспадарчы дзеяч, заслужаны аграном Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер двух ордэнаў Леніна, удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг., партызанскага руху ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну — **105 г.**

**13** — **Данілаў Павел** (1897, Крупскі р-н — 1975), рэжысёр тэатра, драматург, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **125 г.**

**14 — Золак Янка (сапр. Даніловіч Антон)**(1912, Слуцкі р-н — 2000), пісьменнік, журналіст, грамадскі дзеяч, выдавец, у эміграцыі (ЗША) — **110 г.**

**20 — Касач Павел** (1887, в. Рагава (Рогава), Віл. пав., Вілен. губ. (цяпер Мін. р-н) — 1977), дзеяч самадзейнага мастацтва, кампазітар, заслужаны дзеяч культуры Беларусі — **135 г.**

**26 — Тшашчкоўская (Трашчкоўская, дзявочае Манькоўская) Зоф'я** (1847, в. Дарагавіца, Капыл. р-н — 1911), польская і беларуская пісьменніца, перакладчыца — **175 г.**

**26 — Скрыпка Міхась (Міхаіл)**(1907, в. Месцін, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер в. Месціна, Бярэз. р-н) — 1991), пісьменнік-

сатырык, драматург, перакладчык, аўтар зборнікаў баек, вершаў, гумарэсак, аповесцяў і апавяданняў, п’ес, камедый — **115 г.**

**26 — Іваноў Барыс** (1952, Капыл. р-н), жывапісец, графік, мастацкі крытык — **70 г.**

## Снежань

**2** — **Вольны Анатоль (сапраўднае імя Ажгірэй Анатоль Іўсцінавіч)** (1902, Мар’іна Горка, г. — 1937), пісьменнік, сцэнарыст, кінадраматург, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **120 г.**

**4 — Бельскі Аляксандр** (1932, г. Барысаў), архітэктар, лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР — **90 г.**

**10 — Шкаруба Валерый** (1957, г. Барысаў — 2020), жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны — **65 г.**

**11** — **Сабалеўскі Аляксандр** (1942, г. Жодзіна — 2020), архітэктар, аўтар шэрагу праектаў у Мінску і Мінскім раёне, заслужаны архітэктар Беларусі — **80 г.**

**15 — Казлоўскі Мікалай** (1917, в. Гапонавічы, Крупскі р-н — 1972), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

**15 — Ждан Яўген** (1937, в. Тарэйкі, Нясвіж. р-н), графік, жывапісец, тэатральны мастак, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” — **85 г.**

**16 — Казакевіч Данііл** (1902, в. Радзеўцы, Маладзеч. р-н — 1975), ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, кавалер ордэна Леніна — **125 г.**

**16 — Янушкевіч Валяр’ян** (1962, аг. Ракаў, Валож. р-н), скульптар, аўтар твораў у манументальнай і станковай скульптуры — **45 г.**

**19 — Пучынскі Юзаф** (1922, г. Узда — 2007), графік, жывапісец — **100 г.**

**21 — Шулякоўскі Мікалай** (1952, г.п. Плешчаніцы, Лагойскі р-н — 1997), жывапісец — 70 г.

**22** — **Васілевіч Алена** (1922, Слуцкі р-н — 2021), пісьменніца, заслужаны работнік культуры Беларусі (1977), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976) — **100 г.**

**27** — **Кароль Уладзімір** (1912, г. Чэрвень — 1980), народны архітэктар СССР, заслужаны будаўнік Беларусі, правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1968) — **110 г.**

**31 — Муравіцкі Лука** (1917, в. Доўгае, Салігор. р-н — 1941), лётчык, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — 105 г.